**Маўленчая размінка.** Прачытайце лічылку, правільна вымаўляючы гукі [дз’], [ч], [ш], [р], [ц’].

> У лесе, дзе дубкі,
> Выраслі баравікі —
> Адзін, два, тры, чатыры, пяць…
> Трэба ў кошык іх узяць.
>
> *Васіль Жуковіч.*

***Прага́лінка*** — незарослае месца ў лесе, палянка.
(Нязвыклы) ***енк*** — стогн, крык.
***Наха́бнік*** — чалавек, які не мае сораму.
***Бурало́міна*** — зваленае бурай дрэва.
***Ква́піцца*** — мець жаданне, імкнуцца завалодаць чым-небудзь.

## РЫГОР ІГНАЦЕНКА

## Лістападнік

Неяк асеннім днём блука́ў я са стрэльбай па лесе.

У адным месцы пачуў нейкі нязвыклы енк. Здавалася, быццам нехта злёгку на ляльку націска́ў і тая падава́ла свой голас.

Я асцярожна падышоў да залацістага арэшніку і выглянуў з-за куста.



Правообладатель Национальный институт образования

На невялічкай прага́лінцы ляжала струхлелая асіна. А на ёй сойка — прыгожая стракатая птушка. Скача яна ўзбуджана па ствале тудысюды ды ўвесь час уніз нешта пазірае.

Вось яна, бачу, скокнула на грыб-губу́, што казырком рос на асіне, пры самай зямлі, ухапілася дзюбкай за нешта шэранькае і пацягнула на сябе. Гэта, шэранькае, жаласліва і заенчыла!

Пафантазіруйце, што далей адбудзецца ў творы.

Я прыгле́дзеўся — зайчык! Сойка цягнула яго за вуха. Звярок не адбіваўся ад птушкі, не спрабаваў уцячы, а толькі ўсё енчыў, нібыта прасіўся, каб яго адпусцілі.

— Ах ты, наха́бніца! — абурыўся я і замахнуўся на птушку рукою. — Прэч адсюль!

Сойка страка́тай хусцінкай спалохана мільганула над прагалінкай і з крыкам знікла ў хвойніку.

Я падышоў да бураломіны. Зайчык быў зусім яшчэ маленькі і ніку́ды ад мяне не ўцякаў. Такіх позніх зайчанят паляўнічыя лістападнікамі называюць. Я ўзяў яго ў ру́кі. Пушысценькі клубочак зусім не баяўся мяне. Я асцярожна паху́каў на яго. Зайчаня прыціснулася да далоні і сцішылася. Толькі зрэдку вялікімі карымі вочкамі блі́скала. Але таксама не баязліва, даверліва.



Правообладатель Национальный институт образования



Вельмі мне хацелася гэтага зайчыка дамоў узяць. Вось бы абрадаваліся дзеці такому ляснодаму падарунку. І ўсё ж я ўстрымаўся. Пабаяўся, што кот Барсік, які жыве ў нас, пакрыўдзіць пушысціка.

А каб сойка болей не ква́пілася на зайчаня, я аднёс яго глыбей у лес і пасадзіў пад густую елачку. Зайчыха-маці знойдзе яго там. Няхай жыве малое, няхай патопча зімою мяккі сняжок!

1. Які выпадак давялося назіраць паляўнічаму ў лесе? Прачытайце.
2. Як уратавалі зайчаня? Перакажыце гэты эпізод.
3. Чаму паляўнічы не ўзяў зайчыка дамоў? Як гэта характарызуе яго?



Правообладатель Национальный институт образования

4. Хто з’яўляецца героем апавядання: пісьменнік ці паляўнічы? Чаму вы так думаеце?
5. Да слова «зайчык» падбярыце з тэксту аднакаранёвыя/роднасныя словы.
6. Навошта пісьменнік расказаў гэту гісторыю пра зайчыка?
7. Разгледзьце ілюстрацыю да апавядання. Да якога эпізоду яна зроблена? Вусна апішыце малюнкі, якія можна зрабіць да іншых эпізодаў твора.



Падрабязна перакажыце змест апавядання па плане.

П л а н

1. У лесе пачуўся нязвыклы енк.
2. Сойка цягне за вуха шэранькае зайчаня.
3. Нахабніца знікла.
4. Паляўнічы трымае зайчыка ў руках.
5. Дужа хацелася ўзяць яго дамоў.
6. Няхай жыве малое.

**Давайце абмяркуем.** Ці даводзілася вам бываць у асеннім лесе? Раскажыце, што цікавага вы бачылі ў ім.

### ЗАГАДКА

Улетку шэранькі, узімку беленькі,
доўгія вушы мае, хутка ў лес уцякае.



Правообладатель Национальный институт образования